# Форум. Кніга. Час

**III Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры» па тэме «Чытанне і інфармацыйная культура ў сучасным грамадстве» прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Нацыянальная бібліятэка, Беларуская Праваслаўная Царква. У кангрэсе ўзялі ўдзел больш як 500 спецыялістаў, у тым ліку прадстаўнікі Азербайджана, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Фінляндыі. Сярод іх — супрацоўнікі бібліятэк, музеяў, архіваў, выдавецтваў, адукацыйных, навукова-даследчых устаноў і арганізацый, прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай улады, а таксама праграмнага забеспячэння, тэхнічных сродкаў і інфармацыйнай прадукцыі.

Форум адкрыў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі. З прывітальным словам да ўдзельнікаў кангрэса звярнуліся міністр культуры краіны Барыс Святлоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Беларусі Наталля Кучынская, дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Яўген Каваленка, епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін.



Фота Кастуся Дробава.

*Удзельнікі кангрэса знаёмяцца з тэхналагічнымі інавацыямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*

**Чытайце на стар. 2**

Заканчэнне. Пачатак на стар. 1.

# Форум. Кніга. Час

«Сёння ў кожнай пятай бібліятэцы краіны функцыянуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі, абсталяваныя неабходнымі тэхнічнымі рэсурсамі і выданнямі па прававой тэматыцы», — адзначыў кіраўнік НЦПІ Яўген Каваленка. Паводле яго слоў, досвед супрацоўніцтва Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі і бібліятэк сведчыць пра тое, што кніжніцы своечасова рэагуюць на патрабаванні сучаснага інфармацыйнага грамадства, садзейнічаюць павышэнню даступнасці прававой інфармацыі, тым самым — прававой культуры грамадства ўвогуле. Раман Матульскі нагадаў, што Нацыянальная бібліятэка і НЦПІ нядаўна адкрылі першую за межамі нашай краіны віртуальную залу інфармацыйных рэсурсаў Беларусі, а таксама цэнтр эталоннай прававой інфармацыі — у Зале беларускай дыяспары Дзелавога і культурнага комплексу Пасольства Беларусі ў Расійскай Федэрацыі. Ён выказаў спадзяванне, што на гэтым партнёрства Нацыянальнай бібліятэкі і цэнтра прававой інфармацыі не спыніцца.

Адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў I Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — цэнтр духоўна-маральнай асветы і выхавання», заснавальнік якога — Беларускі Экзархат. Епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін уручыў пераможцам граматы, іконы, камплекты кніг.

На пленарным пасяджэнні абмяркоўваліся пытанні развіцця публічных бібліятэк у гістарычным ракурсе, разглядаліся асноўныя вектары дзяржаўнай палітыкі ў галіне бібліятэчнай справы ў кантэксце рэалізацыі дзяржаўных праграм, аналізавалася роля кніжніц у падтрымцы і развіцці чытання, прапаноўваліся шляхі развіцця бібліятэк на сучасным этапе.

Двухдзённая праграма мерапрыемства атрымалася цікавай і насычанай. Пасля пленарнага пасяджэння кангрэс працягнуўся ў фармаце семінараў і «круглых сталоў». Актыўна абмяркоўвалася ўзаемадзеянне ўстаноў культуры, навукі, адукацыі і бізнесу; кіраванне бібліятэкай на сацыяльнай і медыйнай прасторах; абарона правоў інтэлектуальнай уласнасці; роля бібліятэк у захаванні нацыянальнай і сусветнай кніжнай спадчыны; праблемы кадраў і адукацыі ў бібліятэчнай прафесіі ды інш.

Першы дзень мерапрыемства завяршыўся экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У межах кангрэса працавала выставачная пляцоўка, дзе можна было пазнаёміцца з тэхнічнымі і тэхналагічнымі інавацыямі, інфармацыйнымі прадуктамі і паслугамі, набыць выдавецкую і сувенірную прадукцыю. Былі прадстаўлены і работы пераможцаў XXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры», у якім штогод бяруць удзел публічныя бібліятэкі нашай краіны.

**Дар'я ЛАТЫШАВА**